«Мікіта». Пры музеі адкрыты падворак «Каля Плэса», які ўяўляе сабой сапраўдны сялянскі дом, дзе адноўлены побыт жыхароў палескай вёскі. На Вялікдзень у Бездзежы праходзіць унікальны вясновы абрад «Стрэлка».

Унікальны экамузей пад адкрытым небам створаны ў вёсцы Заброддзе на беразе ракі Нарачанка, дзе стагоддзе таму праходзіла лінія фронту Першай сусветнай вайны. Сям'я беларускага мастака і краязнаўца Барыса Цітовіча стварыла ў Заброддзі першы ў Беларусі музей гісторыі Першай сусветнай вайны, які захоўвае больш як 2000 экспанатаў: абмундзіраванне і зброю, procівагаз, дакументы і фатаграфіі, прадметы быту салдат і асабістыя рэчы ў памяць аб блізкіх; музей рэтра-аўтамабіляў, дзе сабраны рарытэты 30–90-х гадоў XX стагоддзя, экспазіцыю матацыклаў і веласіпедаў; музей побыту стогадовай даўнасці (старадаўняя мэбля, ручнікі, адзенне, посуд, музычныя інструменты, фота); кузню і лазню, якой ужо два стагоддзі; творчыя майстэрні мастака і рэжысёра тэатра лялек. На беразе ракі знаходзіцца драўляная Барысаглебская капліца ў памяць аб усіх загінулых у ваенных дзеяннях, пабудаваная ў стылі XVI–XVII стст.. Таксама сярод самых шануемых мясцін Заброддзя і наваколля – лазарэтныя магілкі часоў Першай сусветнай вайны і 6-метровы крыж на пахаванні паблізу ваеннага лагера.

Для паўнаты карціны трэба згадаць таксама, што ў Беларусі існуе шмат музеяў не этнаграфічнага профілю, у калекцыях і экспазіцыях якіх таксама ўключаны этнаграфічныя матэрыялы.

## 🕮 БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Пронина, С. А. Методика фондовой деятельности в этнографических музеях под открытым небом / С.А. Пронина, Т. И. Кимеева // Вестник Томского государственного университета. Культурология и искусствоведение. – 2016. – № 3. – С. 187–197.
2. Сотникова, С. И. Музеология: пособие для вузов / С. И. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. – 192 с.
3. Станюкович, Т. В. Этнографическая наука и музеи / Т. В. Станюкович. – Л. : Наука, Ленинградское отделение, 1978. – 286 с.
4. Стефаненко, Т. Г. Этнопсихология: практикум: учебное пособие для студентов вузов / Т. Г. Стефаненко. – М. : Аспект Пресс, 2006. – 208 с.


# МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТ.): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ


***А. П. Жытко,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*прафесар кафедры гісторыі Беларусі*
*УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”*

***С. А. Талмачова,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”*


Унутрыпалітычны крызіс у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. прывёў да аслаблення дзяржавы. Гэту сітуацыю ў сваіх інтарэсах скарысталі памежныя з ёй манархіі – Расійская, Аўстра-Венгерская і Пруская. У выніку трох падзелаў (1772, 1793, 1795 гг.) Рэчы Паспалітай з карты Еўропы знікла вялікая дзяржава. Праблема Польшчы на працягу XIX – пачатку XX ст. была краявугольнай у знешнепалітычных стасунках еўрапейскіх краін.

Да Расійскай імперыі была далучана сучасная тэрыторыя Беларусі. Разам з тым праблема новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання края і стварэння новых органаў улады і кіравання практычна не з’яўлялася прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і расійскай гістарыяграфіі. У той жа час літаратура па гісторыі саміх падзелаў Рэчы Паспалітай і іх наступствах даволі багатая. У дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі ў якасці галоўнага канцэптуальнага палажэння выступаў пастулат аб непазбежнасці, заканамернасці і справядлівасці далучэння беларускіх, украінскіх і літоўскіх зямель у склад Расійскай імперыі. У прыватнасці, у сваёй шматтомнай працы «История России с древнейших времен» С. Салаўёў разглядаў падзенне Польшчы з пазіцыі нацыянальна-дзяржаўнага інтарэсу Расіі. С. Салаўёў падрабязна праааналізаваў першы падзел 1772 г. у сваёй манагрфіі «История падения Польши», прычыну якога ён выводзіў з унутранай шляхецкай анархіі, а далучэнне зямель ВКЛ да імперыі лічыў перамогай верацярпімасці над польскім фанатызмам [1, с. 582].

У «Курсе русской истории» В. Ключэўскі сцвярджаў, што прускі кароль прымусіў Расію ўдзельнічаць у гвалтоўным падзеле Рэчы Паспалітай замест справядлівага аб’яднання «*западнорусской народности*» [2, с. 37].

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі праводзіцца думка аб калектыўнай адказнасці манархаў Аўстрыі, Прусіі і Расіі за знішчэнне палітычнага існавання Рэчы Паспалітай. Гэта пазіцыя абагульнена ў манаграфіі П. Стэгнія «Разделы Польши и дипломатия Екатерины II. 1772, 1793, 1795» [3].

У дарэвалюцыйны перыяд адсутнічалі манаграфічныя даследаванні, прысвечаныя адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу Беларусі і ўтварэнню новых органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання. Часткова інфармацыя аб гэтым утрымліваецца ў працах агульнага характару. Так, сакратар Мінскага губернскага статкамітэта А. Смародскі, пад кіраўніцтвам якога друкаваліся многія «Памятные книжки…», у 1893 г. выдаў брашуру «Столетие Минской губернии» [4], у якой утрымліваліся шматлікія звесткі аб рэгіёне. Аўтар уключыў у даведнік гістарычны нарыс зямель, што ўваходзілі ў склад Мінскай губерні, урадавыя распараджэнні па далучэнні гэтых зямель да Расійскай імперыі, паказаў склад, адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне і апісанне губерні, прывёў кароткія статыстычныя звесткі аб развіцці губерні на працягу стагоддзя, падаў спіс мінскіх губернатараў, архіярэяў, губернскіх прадвадзіцеляў дваранства і віцэ-губернатараў за стагоддзе.

Інфармацыя аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле і аб дзяржаўных установах змяшчаюцца таксама ў 9 томе «Верхнее Поднепровье и Белоруссия» выдання «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества», якое выйшла пад рэдакцыяй В. Сямёнава ў 1905 г. [5].

У пэўнай ступені гэтыя пытанні знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях Р. Эйхельмана [6], І. Страхоўскага [7] і інш. Значны інтарэс выклікаюць работы У. Еўраінава [8] і В. Гесена [9], якія дазваляюць больш поўна даследаваць асобныя аспекты мясцовага дзяржаўнага ўладкавання ў Расійскай імперыі. Далучэнне тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага і Правабярэжнай Украіны да Расійскай імперыі яны разглядалі як збіранне зямель, якія раней уваходзілі ў дзяржаву Рурыкавічаў, спадкаемцай якой сябе лічыла Расія.

Праблема падзелаў Рэчы Паспалітай, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання на беларускіх землях, стварэння новых органаў улады і кіравання раскрываеццца ў шэрагу артыкулаў дарэвалюцыйнага даследчыка П. Жуковіча [10]. Аўтар падрабязна паказаў не толькі працэс падрыхтоўкі размежавання далучаных тэрыторый, але і фактычнае стварэнне новых губерняў і іх падзел на паветы. П. Жуковіч адзначаў, што Кацярына II не паспела распаўсюдзіць дзеянне сістэмы губернскага судова-адміністрацыйнага кіравання на землі, далучаныя пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай, але яна змагла ўсё ж закласці грунтоўны фундамент для ўвядзеня сістэмы кіравання губернямі па ўзору 1775 г.

У савецкай гістарыяграфіі праблемы дзяржаўнага кіравання і самакіравання амаль да сярэдзіны 1960-х гг. не з’яўляліся прадметам спецыяльнага вывучэння. Панавала меркаванне, што дзяржаўны механізм Расійскай імперыі напачатку XX ст. з’яўляўся архаічным, няздольным да самаўдасканалення, што і з’явілася адной з прычын краху самадзяржаўя.

Толькі ў 1960 г. і ў 1964 г. прафесарам Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута А. Чарновым былі выдадзены матэрыялы даведачнага характару «Государственные учреждения России XVIII в.» [11] і «Государственные учреждения России XIX – начала XX в.», дзе прыведзены звесткі аб заканадаўчых актах, апублікаваных у Поўным зводзе законаў Расійскай імперыі, а таксама аб стварэнні новых устаноў, іх структуры, функцыях, пераўтварэннях і ліквідацыі. У 1968 г. пад рэдакцыяй дацэнта гэтага ж інстытута М. Ярошкіна быў выдадзены дапаможнік «История государственных учреждений дореволюционной России» [12], дзе прадстаўлены звесткі не толькі аб установах, але і прычынах рэформ дзяржаўнага кіравання ў Расійскай імперыі.

Пытанне аб ўсталяванні расійскай сістэмы кіравання на далучаных тэрыторыях закраналі ў сваіх працах беларускія гісторыкі, такія як В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, У. Пічэта [13]. Увагу на працэсе ўсталявання расійскай улады на беларускіх землях пасля падзелаў засяродзіў М. Ільяшэвіч, які коратка разгледзеў асноўныя кірункі царскай палітыкі ў перыяд праўлення Кацярыны II і Паўла I [14].

Усталяванне і эвалюцыя адміністрацыйных органаў улады на далучанай тэрыторыі разглядаліся ў абагульняючых працах беларускіх гісторыкаў: «Гісторыя Беларускай ССР» [15], «Нарысы гісторыі Беларусі» [16], чацвёрты том шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» [17]. У «Нарысах гісторыі Беларусі» была зроблена спроба па-новаму разгледзець нацыянальную гісторыю нашай краіны. Так, уключэнне беларускіх тэрыторый у склад Расійскай імперыі ў дадзеным выданні ацэньвалася ў цэлым пазітыўна, паколькі Беларусь апынулася ў складзе цэнтралізаванай, з моцнай вярхоўнай уладай дзяржавы, што прывяло да пэўнай палітычнай стабілізацыі. На думку аўтараў, быў пакладзены канец феадальнай анархіі, аднак царскі ўрад не прызнаваў існавання беларускага этнасу, а этнічныя і моўныя аспекты пры правядзенні тэрытарыяльна-адміністрацыйных межаў не ўлічваліся [16, с. 329].

Неабходна адзначыць, што ў апошнія дзесяцігоддзі праблемы кіравання і самакіравання на тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі выклікаюць павышаны інтарэс сярод айчынный навукоўцаў – як гісторыкаў,

так і юрыстаў-прававедаў. У прыватнасці, у працах беларускіх юрыстаў закранаюцца пытанні прававога ўладкавання органаў мясцовага дзяржаўнага апарату [18].

У 1990 г. беларускія гісторыкі З. Шыбека і С. Шыбека выдалі кнігу «Минск. Страница жизни дореволюционного города» [19]. У раздзеле «Старые минские адреса» яскрава пададзены факталагічны матэрыял аб дзяржаўных установах г. Мінска.

У 1997 г. С. Токць абараніў кандыдацкую дысертацыю па праблеме мясцовага дзяржаўнага апарату ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст., у якой прадметам даследавання з'яўляліся мясцовы дзяржаўны апарат Міністэрства ўнутраных спраў і яго кадравы склад [20].

У 2007 г. пабачыла свет манаграфія А. Кісялёва «Система управления и чиновничества белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в.», у якой аўтар прааналізаваў стварэнне новых органаў улады з часоў імператара Паўла I да сярэдзіны XIX ст., выявіў іх функцыі, а таксама склад чыноўнікаў. Пры гэтым А. Кісялёў у асноўным акцэнтаваў увагу на мясцовых органах Міністэрства ўнутраных спраў і суда. Органы гаспадарча-эканамічнага кіравання практычна не з'яўляліся прадметам даследавання [21].

Шэраг аспектаў, прысвечаных дадзенай праблеме, прааналізаваў даследчык Я. Анішчанка [22].

Пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, стварэння генерал-губернатарстваў, губерняў і паветаў знайшлі сваё адлюстраванне ў шэрагу артыкулаў А. Філатавай [23], Я. Анішчанка [24], А. Госцева і В. Шведа [25], В. Шалкапляс [26], М. Ермаловіча [27] і інш. Разам з тым, у артыкуле А. Госцева і В. Шведа «Гродзенская губерня», як і ў артыкуле А. Філатавай «Віцебская губерня» дапушчана аднолькавая памылка – плошча гэтых губерняў павялічана ў 10 разоў, што не адпавядае рэчаіснасці.

Я. Анішчанка, як і М. Ермаловіч, дапусцілі памылку, калі ўказвалі, што Літоўскае генерал-губернатарства праіснавала да 1800 г. На самай справе з канца 1796 г. яно было пераўтворана ў ваенае губернатарства [28].

У сваей манаграфіі В. Швед закранаў праблему ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Аднак, аўтар неабгрунтавана аперыруе статыстычным матэрыялам. Так, В. Швед сцвярджае, што ў выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай ***«з зямель Беларусі*** Расія атрымала частку Віленскага ваяводства, Мінскае, ***Брацлаўскае***, усходнюю частку Навагрудскага, Брэст-Літоўскага ваяводстваў – усяго каля 250 тыс. кв. км з насельніцтвам каля 3 млн чал.» [30, с. 81]. Па-першае, Брацлаўскае ваяводства – гэта тэрыторыя Украіны, а па-другое, лічбы, прыведзеныя аўтарам, тычацца тэрыторыі і насельніцтва беларускіх і украінскіх зямель.

Значны ўнёсак у распрацоўку праблемы дзейнасці органаў мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1856 гг. зрабіла І.М.Трасцян, якая ў 2018 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Эволюция системы местных органов государственной власти на территории Беларуси (1772–1856 гг.)»[29].

Аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам А. П. Жытко быў падрыхтаваны вучэбны дапаможнік "Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)" [31].

Значным дасягненнем беларускай гістарычнай навукі з'яўляецца грунтоўнае выданне «История белорусской государственности». Другі том прысвечаны перыяду ўваходжання тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Шэраг раздзелаў прысвечаны функцыянаванню мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання на тэрыторыі Беларусі [32].

Удасканаленне сістэмы дзяржаўнага кіравання – задача актуальная ва ўсе часы. Ускладненне сфер грамадскага жыцця выклікае неабходнасць стварэння больш эфектыўных форм кіравання. На гэтым шляху дзяржаўная ўлада, як аб'ектыўны сродак удзелу членаў грамадства ў функцыянаванні любой сацыяльнай сістэмы, непазбежна трансфармуецца ў новыя формы, у якіх значную ролю адыгрывае грамадскае самакіраванне. Паколькі правы і інтарэсы насельніцтва краіны шмат у чым залежаць ад дзеяздольнасці самакіравання як формы мясцовага кіравання, то ступень яго развіцця аказвае непасрэдны ўплыў на сістэму ўлады ўвогуле.

Адмена прыгону непазбежна прывяла да змен у дзяржаўным механізме Расійскай імперыі. Дзейнасць органаў сялянскага самакіравання з часу свайго юрыдычнага афармлення прыцягвала ўвагу розных колаў грамадства. Асобныя дадзенай праблемы разглядалі сучаснікі рэформы – У. Безабразаў [33], А. Васільчыкаў [34], А. Кошалеў [35], К. Стэфановіч [36], А. Арапаў [37], М. Катаеў [38], А. Мілавідаў [39]. Агульная ідэя гэтых публікацый заключалася ў неабходнасці рэфармавання ўсіх мясцовых устаноў, і перш за ўсё сялянскіх. Некаторыя з аўтараў сканцэнтравалі ўвагу на шкоднасці для сялян залішняй апекі з боку мясцовай адміністрацыі, а іншыя, наадварот, лічылі, што апека была недастатковай. К. Стэфановіч, А. Арапаў, А. Мілавідаў указвалі, што ў Паўночна-Заходнім краі неабходна ўвядзенне моцнай улады, якая б кіравала дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання. Іх працы змяшчаюць значны фактычны матэрыял, аднак яны пераважна публіцыстычнага характару.

У савецкай гістарыяграфіі ёсць шмат работ, у якіх асвятляецца дзейнасць органаў сялянскага самакіравання асобных рэгіёнаў. Сярод іх можна вылучыць працы М. Дружыніна [40], П. Зайанчкоўскага [41] і інш. Усе яны напісаны на падставе класавага падыходу, таму захоўваюць схільнасць да палітызацыі праблемы.

У цэлым у савецкай гістарыяграфіі роля сялянскага самакіравання прыніжалася. Галоўным было палажэнне, што ў самадзяржаўнай Расіі рэальнага самакіравання не магло быць. А між іншым, царская адміністрацыя надавала яму важнае значэнне, асабліва ў беларуска-літоўскіх губернях, каб нейтралізаваць уплыў на сялян дваранства рымска-каталіцкага веравызнання.

У работах беларускіх гісторыкаў М. Фрыдман [42] і Л. Ліпінскага [43] ўказвалася, што органы сялянскага самакіравання мелі фіскальны характар, гаварылася аб поўнай залежнасці выбарных сялянскіх устаноў ад мясцовага дваранства. Разам з тым, насуперак гэтым сцвярджэнням, прыводзіцца шмат фактаў, якія са станоўчага боку раскрываюць рэалізацыю органамі сялянскага самакіравання фінансава-падатковай, прадстаўнічай, вытворчай функцый, а таксама некаторых іншых. Значны ўклад у распрацоўку азначанай праблемы ўнёс В. Панюціч [44]. У шматлікіх публікацыях, прысвечаных парэформеннай вёсцы, ім раскрываюцца многія бакі жыцця сялянства, у тым ліку і дзейнасць абшчыны. У 90-х гадах XX ст. пабачылі свет калектыўныя працы «Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён» (у 3 т.) [45], «Гісторыя Беларусі» (у 6 т.) [17], у якіх закранаціся і праблемы сялянскага самакіравання.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі гісторыі дваранскага самакіравання ў Расійскай імперыі прысвечаны шэраг прац. Сярод іх працы В. Ключэўскага, М. Яблачкава, А. Рамановіча-Славацінскага і інш. [46], у якіх вышэйшае саслоўе даследавалася да 1861 г. Гісторыя дваранства парэформеннага часу не падвяргалася глыбокаму навуковаму вывучэнню, хаця дваранскае пытанне ў гэтыя гады стала прадметам жорсткай палемікі паміж рознымі грамадска-палітычнымі лагерамі і плынямі. Інтарэс да вышэйшага саслоўя паслярэформеннай Расіі быў выкліканы тым, што сацыяльная база імперыі – дваранства – паступова страчвала свае палітычныя пазіцыі ў выніку правядзення буржуазных рэформ. Акрамя таго, вышэйшае саслоўе, якое мела моцную падтрымку з боку самадзяржаўя да 1861 г., не змагло своечасова і адэкватна адрэагаваць на тыя змены ў эканамічным развіцці імперыі, якія адбыліся ў другой палове XIX ст.

Што тычыцца вышэйшага саслоўя заходніх губерняў, то яго дарэвалюцыйная гістарыяграфія значна бяднейшая па колькасці прац і іх навуковасці. У парэформенныя гады, асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг., царскія ўлады хвалявала пытанне, на якіх падставах будаваць сваю палітыку адносна розных саслоўяў на гэтай тэрыторыі. Асабліва гэта тычылася мясцовага пазямельнага і служылага дваранства. Актыўны ўдзел прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя рымска-каталіцкага веравызнання ў паўстанні 1863–1864 гг., асабліва дробнай шляхты, фактычна да 1917 г. абумовіў жорсткую палітыку царызму ў дачыненні да гэтай катэгорыі саслоўя і да інстытутаў дваранскага самакіравання ў Заходнім краі [47].

У савецкай гістарыяграфіі практычна да 70-х гадоў не існавала даследаванняў, прысвечаных гісторыі дваранства і дваранскаму самакіраванню. Значнай падзеяй з'явіўся выхад у свет манаграфіі А. Карэліна [48]. Упершыню аўтар на падставе матэрыялаў Асобай нарады па справах дваранскага саслоўя (1897–1901 гг.) прааналізаваў юрыдычны, колькасны і нацыянальны склад дваранства імперыі, яго сацыяльна-эканамічны статус, даследаваў карпаратыўную арганізацыю саслоўя, яго ролю ў сістэме мясцовага кіравання.

Для беларускай савецкай гістарыяграфіі былі характэрны тыя ж тэндэнцыі, што і для ўсіх гістарычных даследаванняў былога СССР, толькі са сваёй рэгіянальнай спецыфікай. Па сутнасці да 1980 г. беларускія гісторыкі абыходзілі дваранскую праблематыку. У гэтым кірунку прарыў быў зроблены С. Самбук [49], якая прааналізавала палітыку самадзяржаўя ў Беларусі ў адносінах да дваранства і яго органаў самакіравання.

Праблемамі шляхты/дваранства займаліся С. Лугаўцова, Г. Туміловіч. Так, С. Лугаўцова сцвярджала, што распараджэнні цэнтральных улад адносна дваранскага самакіравання пры Аляксандры I былі накіраваны на збліжэнне заканадаўства аб выбарах з агульнарасійскім [50]. Даследчыца прыйшла да высновы, што роля дваранства Беларусі на працягу 30–50-х гадоў XIX ст. у мясцовым кіраванні паступова зніжалася ў сувязі з увядзеннем цэнзу ў 1831 г. і ростам значэння апарату чыноўнікаў Расійскай імперыі. Такая палітыка прывяла амаль да поўнага зліцця заканадаўства аб выбарах у беларускіх губернях з агульнарасійскім [50, с. 17, 38]. У сваім даследаванні Г. Туміловіч вылучыла этапы дзяржаўнай палітыкі па разборы шляхты [51]. Праблема аднаўлення органаў дваранскага самакіравання знайшла адлюстраванне ў манаграфіі А. Жытко [52].

Патрэбна зазначыць, што, нягледзячы на даволі значную колькасць прац, дваранская саслоўная арганізацыя, яе роля і месца ў сістэме мясцовага самакіравання і дзяржаўнага кіравання не знайшлі належнага адлюстравання ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі.

Пытанні, звязаныя з вывучэннем гарадскіх рэформ у Расіі, традыцыйна прыцягвалі да сябе ўвагу даследчыкаў. Асобныя аспекты гарадскога самакіравання другой паловы XIX – пачатку XX ст. знайшлі адлюстраванне ў працах У. Гесена, Д. Сямёнава, Г. Джаншыева, К. Пажытнова, Г. Шрэйдэра [53]. У іх галоўная ўвага надавалася гісторыка-прававому аналізу рэформ 1870 г. і 1892 г. Аднак названыя даследчыкі не ўдзялялі ўвагі асаблівасцям рэалізацыі рэформ на тэрыторыі Беларусі.

У савецкай гістарыяграфіі з'явіліся даследаванні, прысвечаныя асобным аспектам дадзенай праблематыкі. У прыватнасці, у манаграфіі П. Зайанчкоўскага атрымала асвятленне тэма падрыхтоўкі Палажэння 1892 г. [54].

Гарадскому самакіраванню 60-х – пачатку 90-х гадоў XIX ст. прысвяціла свае даследаванні В. Нардава [55]. У іх разглядаюцца пытанні падрыхтоўкі і правядзення гарадскіх рэформ 1870 г. і 1892 г., палітыка царызму ў адносінах да гарадскога самакіравання.

Беларускія даследчыкі вывучалі некаторыя аспекты дзейнасці гарадскога самакіравання. Так, С. Самбук [49] даследавала праблемы ўвядзення гарадскога самакіравання ў сувязі з абмежавальнай палітыкай царызму ў краі. У. Слабажанін [56], аналізуючы праблему земскага самакіравання, зрабіў асобныя істотныя высновы па пытаннях правядзення рэформ самакіравання, узаемаадносін органаў дзяржаўнага кіравання і гарадскога самакіравання. У выданнях З. Шыбекі даследаваліся асобныя пытанні, якія тычыліся дзейнасці органаў гарадскога самакіравання [57]. Рэалізацыя Гарадавых палажэнняў разгледжана ў публікацыях І. Грыбко [58]. Некаторыя аспекты праблемы даследаваны І. Юхо і М. Юрачкіным [59].

Важны ўклад у даследаванне праблем земскага самакіравання ў дарэвалюцыйны перыяд унёс Б. Весялоўскі, які апублікаваў шматтомную працу «История земства за 40 лет» [60]. Ён паказаў земскую справу ва ўсіх яе праявах і імкнуўся прыцягнуць увагу даследчыкаў і земскіх дзеячаў да галоўных праблем земскага жыцця, неабходнасці паслядоўнай дэмакратызацыі органаў самакіравання. Сутнасць самакіравання У. Безабразаў вызначаў як «*управление по законам и через законы*» [33]. А. Васільчыкаў [34] абгрунтаваў незалежнасць мясцовага самакіравання ад дзяржавы. На яго думку, самакіраванне – гэта вырашэнне гаспадарчых спраў мясцовага характару, а не спраў дзяржаўнага кіравання.

У савецкі час гісторыкі грунтоўна вывучалі шматлікія праблемы, звязаныя з дзейнасцю земстваў, аднак высновы, да якіх прыходзілі аўтары, часта мелі палітычную афарбоўку. Прамую сувязь земскай рэформы з адменай прыгону вызначыла Л. Захарава, а Палажэнне 1890 г. характарызавала як контррэформу [61]. У сучаснай расійскай гістарычнай навуцы цікавасць да земскай рэформы працягваецца. Сярод найбольш значных публікацый можна вылучыць калектыўную працу «Земское самоуправление в России, 1864–1918» [62], падрыхтаваную супрацоўнікамі Расійскай акадэміяй навук. Аднак гэта даследаванне тычыцца цэнтральных расійскіх губерняў. Праблема земскага самакіравання на тэрыторыі Беларусі ў пэўнай ступені знайшла адлюстраванне ў працы У. Слабажаніна [56].

Пытанні саслоўнага (сялянскага і дваранскага) і бессаслоўнага (гарадскога і земскага) самакіравання ў парэформенны перыяд шырока раскрыты ў калектыўнай манаграфіі «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» [64].

Найбольш грунтоўна арганізацыя і функцыяванне органаў дзяржаўнай улады, кіравання, судовай сістэмы і грамадскага самакіраання раскрыты ў другім томе акадэмічнага выдання «История белорусской государственности [65]», аўтарамі раздзелаў якой з'яўляюцца А. Жытко, С. Талмачова, І. М. Трасцян. Асобныя аспекты адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання і сістэмы органаў дзяржаўнага кіравання ў Беларусі знайшлі адлюстраванне і ў шэрагу артыкулаў указаных аўтараў [66], а таксама ў публікацыях А. Падарожняй [67].

Значным укладам у распрацоўку праблемы гісторыі мясцовых дзяржаўных устаноў з'явіліся выданні, падрыхтаваныя супрацоўнікамі БелНДІДАС [68].

Праблема адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання і дзяржаўнага кіравання нацыянальнымі ўскраінамі стала адной з ключавых у расійскай і замежнай гістарыяграфіі ў 1990-х гг. – пачатку XXI ст. Адной з прычын такой з'явы стала тое, што ў гэты час у Расійскай Федэрацыі ўзмацніўся сепаратызм нацыянальных меншасцей, асабліва на Каўказе.

Невыпадкова ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі пытанне пра развіццё дзяржаўнага кіравання на заходніх межах Расійскай імперыі атрымала даволі шырокае асвятленне. З'явіўся шэраг калектыўных і манаграфічных выданняў, у якіх знайшлі адлюстраванне праблемы стварэння і функцыянавання адміністрацыйнага апарату ў Расійскай імперыі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Да такіх прац адносіцца шасцітомны слоўнік-даведнік «Государственность России….» [69], у якім утрымоўваюцца звесткі аб гісторыі стварэння, структуры, функцыянаванні, штатах, умовах рэфармавання ці ліквідацыі дзяржаўных устаноў усіх узроўняў улады і кіравання да 1917 г. У 2003 г. быў выдадзены даведнік «Губернии Российской империи….» [70], у якім змешчаны пералік кіраўнікоў мясцовых адміністрацый і даныя аб адміністрацыйным уладкаванні губерняў. У двухтомнай калектыўнай працы расійскіх аўтараў «Институт генерал-губернаторства и наместничества в Российской империи» дадзена прававая характарыстыка інстытута Віленскага генерал-губернатарства да часу яго ліквідацыі ў 1912 г. [71].

Змены ў сістэме кіравання і ва ўзаемаадносінах уладных структур з мясцовым насельніцтвам на тэрыторыі Беларусі аўтары калектыўных выданняў «Западные окраины Российской империи» і «Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления» звязваюць з паўстаннем 1863–1864 гг. і нацыянальнымі рухамі [75].

Праблемам дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі на беларускіх і літоўскіх землях у XIX ст. прысвяцілі свае працы шэраг сучасных расійскіх гісторыкаў, якія разглядаюць гісторыю Беларусі ў азначаны перыяд з новых

метадалагічных пазіцый. Л. Гарызонтаў і А. Мілер адзначылі непаслядоўнасць царскай палітыкі і перавагу бюракратычных метадаў у кіраванні на заходніх ускраінах імперыі [73], А. Камзолава звярнула ўвагу на вялікую ролю інстытута генерал-губернатарства ў кіраванні беларускімі і літоўскімі землямі. На яе думку, шмат што залежала ад індывідуальнага падыходу кожнага генерал-губернатара, які акрэсліваў метады інтэграцыі краю з цэнтрам. Генерал-губернатар не столькі наглядаў за адпрацаваным механізмам дзяржаўнай машыны, колькі сам наладжваў і накіроўваў яе ход [74]. Палітыка імперскіх улад у заходніх губернях прааналізавана ў калектыўнай манаграфіі вядучых расійскіх спецыялістаў «Западные окраины Российской империи» [75]. Вывучэнню ролі інстытута намеснікаў і генерал-губернатараў быў прысвечаны шэраг іншых прац [76].

Расійскі гісторык А. Бахтурына ў доктарскай дысертацыі разгледзела праблему дзяржаўнага кіравання заходнімі губернямі імперыі напачатку XX ст. Аднак у полі яе зроку апынуліся пераважна палітычныя сістэмы Фінляндыі і Польшчы, у той час як губерні Віленскага генерал-губернатарства даследаваны ў агульных рысах [77]. У сваёй манаграфіі А. Бахтурына прыйшла да высновы, што ліквідацыя Віленскага генерал-губернатарства была выклікана імкненнем уладаў скасаваць адмысловы адміністрацыйны статут заходніх ускраін, увесці ў іх земскія ўстановы. Адносна шырокая характарыстыка заканадаўчай базы органаў мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі была зроблена ў працы расійскага даследчыка М. Краснякова [78].

Цэлы шэраг аўтараў – Б. Міронаў, А. Іёнава, Л. Лапцева [79] і інш. у пэўнай ступені закраналі дадзеную праблематыку ў сваіх даследаваннях.

У замежнай гістарыяграфіі вялікую ўвагу да праблем гісторыі Беларусі традыцыйна праяўляюць польскія гісторыкі, аднак прадметам іх даследаванняў з'яўляецца палітыка царызму ў сувязі з паўстаннямі 1794 г., 1830–1831 гг., 1863–1864 гг. і фарміраваннем адміністрацыйнага апарату, закліканага праводзіць рэпрэсіўную палітыку ў адносінах да мясцовага каталіцкага насельніцтва [80]. У сувязі з гэтым высновы польскіх даследчыкаў нярэдка носяць суб'ектыўны характар.

У заходняй гістарыяграфіі адбыўся зварот у бок разгляду Расіі як шматнацыянальнай імперыі. Праблема адміністрацыйнага ўладкавання разглядалася як кіраванне рознымі тэрыторыямі імперыі. Фокус даследавання перамяшчаўся з цэнтра на перыферыю. На Захадзе яшчэ ў 1960–80-е гг. урадавы апарат Расіі, яго колькасны і сацыяльны склад вывучаліся ў рамках «новай палітычнай гісторыі». Гэту дысцыпліну адрознівала цікавасць да функцыянавання сацыяльных структур і ўладных механізмаў, да палітычнай культуры рускага чыноўніцтва.

У замежнай гістарыяграфіі шэраг даследчыкаў звярнуліся да праблем фармавання органаў кіравання на месцах. У 1981 г. Н. Вейсман прыйшоў да высновы, што напачатку XX ст. рэфармаванне мясцовага адміністрацыйнага апарату набыло ключавое значэнне для правячага рэжыму, паколькі гаворка ішла пра забеспячэнне таго мінімуму кіравання, без якога краіна не магла існаваць [81]. Гэту думку падтрымаў Т. Персон, які паказаў, што рэфармаванне мясцовага кіравання з'яўлялася індыкатарам стану Расійскай імперыі і мела велізарнае значэнне для выжывання царскага рэжыму [82]. У 1980-е гг. гісторык Р. Робінс [83] разглядаў пытанні дзейнасці і пасрэдніцкай ролі губернатараў паміж цэнтральнай і мясцовай бюракратыяй, функцыянаванне мясцовай адміністрацыйнай машыны, адносіны губернатараў са сваімі падначаленнымі і сацыяльнымі інстытутамі, якія не ўваходзілі пад іх прамы кантроль, сродкі і спосабы забеспячэння парадку ў губерні. Прадметам даследавання аўтара з'яўляліся асноўныя механізмы функцыянавання адміністрацыйных структур вялікарасійскіх губерняў, што было характэрна і для беларускіх земляў.

Маштабным даследаваннем па тэме з'яўляецца праца амерыканскага даследчыка Т. Уікса «Нация и государство в России позднего имперского периода» [84], у якой аўтар разгледзеў заходнія ўскраіны як рэгіён, дзе склалася цэласная сістэма органаў дзяржаўнага кіравання, якая мела свае асаблівасці. У прыватнасці, ён даследаваў пытанні ўвядзення земства ў Заходнім краі. Да важных высноў адносна арганізацыі сістэмы кіравання ў Беларусі прыйшоў даследчык С. Бекер. Ён адзначаў, што для рашэння спецыфічных адміністрацыйных праблем заходніх губерняў імперыі дзейнічаў інстытут генерал-губернатарства, які спрыяў іх інтэграцыі ў імперыю. Ён адзначаў, што адной з ключавых задач функцыянавання інстытута генерал-губернатарства ў паўночна-заходніх губернях з'яўлялася падтрымка ўнутранай і знешняй бяспекі імперыі [85].

